ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 38 (1074) ● Чацвер, 26 снежня 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.




*МАЛЮНАК В. РОШЧЫНА*

## У ПРАЦЫ І ПОШУКУ

Нашы інтэрв'ю

**НА ПЫТАННЕ «ЧЫМ ЗНАМЯНАЛЬНЫ ГОД, ЯКІ АДЫХОДЗІЦЬ?» АДКАЗВАЮЦЬ:**

### Загадчык кафедры неарганічнай хіміі В. В. СВІРЫДАЎ

Для мяне адыходзячы год быў, мабыць, найбольш знамянальны тым, што, абараніўшы ў мінулым годзе доктарскую дысертацыю, якая, як дамоклаў меч, вісела нада мной больш двух гадоў і перашкаджала па-сапраўднаму ўдзяляць увагу рабоце кафедры, я стаў свабодны і атрымаў магчымасць рабіць тое, што дае больш задавальнення і прыносіць большую карысць, чым звядзенне работ, якія выконваліся ў розны час і па розных прычынах, у адзін пухлы том.

На кафедры неарганічнай хіміі, за работу якой я адказваю, на працягу апошніх пяці год сфарміраваўся вялікі творчы калектыў. Адных кандыдатаў навук у нас працуе 24; з іх 14—навуковыя супрацоўнікі. Большасць з астатніх 30 навуковых супрацоўнікаў і інжынераў кафедры — вопытныя, здольныя даследчыкі.

У гэтым годзе мы прыклалі шмат намаганняў для таго, каб як мага цясней звязаць дзейнасць нашых навуковых сектараў з вучэбным працэсам і каб у вучэбны працэс унесці як мага больш элементаў навуковага даследавання. Мы спрабуем змяніць методыку выкладання спецкурсаў, каб студэнты навучыліся ў большай меры, чым зараз, самастойна працаваць з навуковай літаратурай.

У гэтым навучальным годзе я прачытаў новы лекцыйны курс «Уводзіны ў спецыяльнасць» для студэнтаў-першакурснікаў. Хачу думаць, што гэта пойдзе ім на карысць.

### Дэкан матэматычнага факультэта М. С. ГАРАШЧУК

— Чым прыкметны мінулы год для нашага факультэта?

Здаецца, нічога асаблівага не адбылося. Як і заўсёды, лекцыі, залікі, экзамены, факультэцкія мерапрыемствы, сустрэчы з гасцямі матфака.

І ўсё ж галоўнае — палепшылася агульная паспяховасць студэнтаў. Больш стала сярод іх такіх, што займаюцца толькі на «добра» і «выдатна». І гэта радуе.

Ажывілася ў нас сёлета камсамольская работа. Есць поспехі і ў галіне навукова-даследчай дзейнасці. Студэнты матфака прадстаўлялі нашу рэспубліку на Усесаюзнай алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», завяршаючы этап якой праходзіў у Маскве, і занялі там прызавыя месцы.

Увогуле калектыў у нас добры, дружны. Мы сябруем з усімі факультэтамі універсітэта і заўсёды гатовы раздзяліць з імі радасць атрымання першых месц і ў вучобе, і ў спорце, і ў мастацкай самадзейнасці.

Адчуваецца, што студэнты за год атрымалі больш вопыту, а выкладчыкі, як і раней, імкнуліся не старэць. Па сакрэту — усе мы ў наступным годзе збіраемся здаць комплекс ГПА толькі на залатыя значкі.

Ёсць яшчэ навіна: на факультэце будзе ўведзена новая спецыяльнасць — тэарэтычная механіка. Гэта адаб'ецца і на назве факультэта — ён стане механіка-матэматычным.

Што датычыцца свайго асабістага жыцця? Сустракаючы 1974 год, планаваў больш актыўна заняцца навуковай і педагагічнай работай. Але ў чэрвені мяне абралі дэканам...

## ШЧАСЦЯ, ПОСПЕХАЎ!

**Вось і яшчэ адзін год адыходзіць у гісторыю. Мы ўспамінаем пражытае, падводзім вынікі, робім агляд сіл і намячаем новыя планы, каб рухацца наперад.**

**У гэтыя дні на факультэтах і на кафедрах, ва ўсіх падраздзяленнях БДУ праходзяць сходы, на якіх адзначаюцца пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва, выяўляюцца рэзервы для далейшага паляпшэння усёй педагагічнай, навукова-даследчай і грамадскай работы.**

**У студэнтаў канец года супадае з самай гарачай падрыхтоўкай да экзаменацыйнай сесіі.**

**Год-працаўнік завяршае свой бег. На парозе новы, 1975-ы. Няхай ён прынясе кожнаму здзяйсненне мар і планаў. Будзьце шчаслівымі, сябры!**



## АГЛЯД КАМСАМОЛЬСКІХ РАДОЎ

Аб стане і мерах па паляпшэнню арганізацыйна-масавай работы ў камсамольскіх арганізацыях універсітэта ў сувязі з абменам камсамольскіх дакументаў гаварылі камсамольцы БДУ на сваім чарговым пленуме. З дакладам выступіў сакратар камсамольскай арганізацыі У. А. Навумовіч.

Аналіз дзейнасці пярвічных камсамольскіх арганізацый універсітэта паказвае, што ў асноўным камітэты камсамола факультэтаў, камсамольскія бюро курсаў, кафедр мэтанакіравана вядуць работу па выкананню рашэнняў XXIV з'езда КПСС і XVII з'езда ВЛКСМ. Іменна клопатам аб павышэнні баявітасці і згуртаванасці, актыўнасці пярвічных камсамольскіх арганізацый, іх арганізацыйна-палітычным умацаванні было прадыктавана рашэнне XVII з'езда ВЛКСМ аб абмене камсамольскіх дакументаў.

ІІ пленум ЦК ВЛКСМ у адпаведнасці з рашэннямі з'езда прыняў пастанову аб правядзенні абмену камсамольскіх дакументаў на працягу 1975—1976 гг.

Характэрнай асаблівасцю абмену камсамольскіх дакументаў і ўмовай яго паспяховага правядзення з'яўляецца тое, што ўся падрыхтоўчая работа ў пярвічных камсамольскіх арганізацыях разгортваецца у перыяд завяршэння абмену партыйных дакументаў, што стварае магчымасць у поўнай меры выкарыстоўваць багаты вопыт партыйных арганізацый рэспублікі у яго правядзенні. Выпрацоўваючы праграму дзеяння на ўвесь перыяд падрыхтоўкі і абмену камсамольскіх дакументаў, кожная пярвічная камсамольская арганізацыя павінна вызначыць галоўныя для сябе задачы. Вось толькі некаторыя з іх:

— павышэнне узроўню падрыхтоўкі будучага спецыяліста, барацьба за якасць усёй работы, якая павінна стаць галоўнай на сённяшнім этапе узмацнення авангарднай ролі камсамольскіх арганізацый у справе падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі;

— умацаванне ідэйнай, класавай загартоўкі моладзі;

— узмацненне выхавання ў духу камуністычнай маральнасці, эстэтычнага выхавання, фарміраванне духоўных каштоўнасцей;

— далейшае арганізацыйна-палітычнае умацаванне камсамольскіх арганізацый.

Абмену камсамольскіх дакументаў неабходна падпарадкаваць далейшае ўдасканаленне стылю і метадаў дзейнасці камсамольскіх арганізацый па камуністычнаму выхаванню моладзі.

Абмеркаванне гэтага пытання на пленуме камітэта камсамола — пачатак вялікай і адказнай справы, сур'ёзнага выпрабавання камсамольскай арганізацыі, агляду сіл маладых барацьбітоў за камунізм на баявым маршы. Камітэт камсамола хацеў бы звярнуць на гэта ўвагу камсамольскага актыву, усіх камсамольцаў універсітэта.

На пленуме выступілі: сакратар камітэта камсамола геафака С. Субоцін, студэнт V курса філфака, адказны за работу ідэалагічнага сектара М. Прыгодзіч, член бюро, адказны за работу сектара вучэбнай і навукова-даследчай работы У. Пузікаў, студэнтка біяфака С. Абраскова, сакратар камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў хімфака А. Скарапанаў, член ідэалагічнай камісіі камітэта камсамола У. Карагін, загадчык аддзела камсамольскіх арганізацый Кастрычніцкага раёна РК ЛКСМБ М. Кавалеўскі і іншыя. Яны гаварылі аб важнасці работы па падрыхтоўцы да абмену камсамольскіх дакументаў, аб задачах, якія стаяць перад камсамольскімі арганізацыямі кожнага факультэта ў сувязі з абменам.

У заключэнне з інфармацыяй аб ходзе рэалізацыі крытычных заўваг і прапаноў, выказаных камсамольцамі на XXV справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі, выступіў намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ В. Андруховіч.

# ВЫХАВАННЕ ВЫХАВАЦЕЛЯЎ

Вучоба камсамольскага актыву — гэта значыць выхаванне выхавацеляў. І ад таго, як выхоўваюцца апошнія, у немалой ступені залежыць якасць кіраўніцтва камсамольскай арганізацыяй, тым больш такой шматлікай, як на матфаку. На гэтым і сканцэнтравала ў асноўным сваю ўвагу выступіўшая на адкрытым партыйным сходзе студэнтаў і супрацоўнікаў матэматычнага факультэта сакратар камітэта камсамола Вера Пракашава.

Вучоба членаў камітэта камсамола факультэта праходзіць у адпаведных секцыях камітэта камсамола універсітэта, у сваю чаргу яны праводзяць заняткі на патоках з сакратарамі паточных бюро.

Камсамольскай работай ахоплена 259 студэнтаў-матэматыкаў. Гэта галоўным чынам кіраўнікі ніжэйшага і сярэдняга звяна (група, курс).

Такая армія камсамольскіх работнікаў можа зрабіць вельмі многае, але ж гэта, у сваю чаргу, стварае пэўныя цяжкасці: робіць нялёгкай індывідуальную работу. І ўсё ж на факультэце з пачатку новага навучальнага года праведзена некалькі занняткаў з камсамольскім актывам першага курса і з групоргамі і сакратарамі паточных бюро.

Галоўным у дакладзе Веры Прокашавай была характарыстыка дзейнасці камсамольскага актывіста.

Ці можа яго работа вычэрпвацца выкананнем камсамольскіх абавязкаў унутры групы? Ці застаецца актывіст сам сабой за сценамі аўдыторыі? Даклад выклікаў вялікую зацікаўленасць.

**М. КАЗЕЙКА.**

## НА ФПМ

На факультэце працягваецца вучоба камсамольскага актыву. Нядаўна Ірына Швец, намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце, правядзіла чарговыя заняткі з камсоргамі І—ІІІ курсаў. Яна расказала актывістам аб тым, як патрэбна афармляць камсамольскую дакументацыю.

***

Студэнцкі тэатр мініяцюр, які існуе на факультэце ўжо два гады, карыстаецца вялікай папулярнасцю.

Рэжысёр тэатра С. Бучэльнікаў і кампазітар С. Наскоў — студэнты-трэцякурснікі.

У самадзейных акцёраў цікавыя планы на будучыню. Заканчваецца падрыхтоўка наваградняй праграмы. А напярэдзе — праца над святочным прадстаўленнем, прысвечаным пяцігадоваму юбілею факультэта, і падрыхтоўка да вечара памяці Віктара Хары.

**І. ТРАЦЦЯКОВА,**
**Л. РАМЕНЬЧЫК,**
**студэнткі факультэта журналістыкі.**





**Сесія, сесія... Яе не баяцца тыя, хто ўпарта вучыўся ў семестры, адводзіў бібліятэцы, дадатковым заняткам кожны дзень па дзве-тры гадзіны вольнага часу.**

**НА ЗДЫМКАХ:**

**Упэўнена ў сваіх адказах на заліках і экзаменах студэнтка II курса вячэрняга аддзялення матфака Галіна Ягоўдзік (фота злева).**

**Ідзе калектыўны разбор задачы студэнтамі М. Карніенкам (III курс), В. Чарняўскай (IV курс) і В. Смародзіным (IV курс) матфака.**

**Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.**

# СЕСІЯ: ЧАС І ТЫ

Сесія. Гэтае слова не пакіне абыякавым ніводнага студэнта. Крыху таямніча яно гучыць для тых, хто яшчэ не ведае, што гэта такое, — для першакурснікаў. А яна, сесія, ужо ўладарна стукаецца ў дзверы аўдыторый і кабінетаў. Шмат пытанняў, шмат праблем устае зараз перад студэнтамі, якія толькі сёлета прыйшлі ва універсітэт. Адна, і самая, бадай, галоўная з іх — праблема часу. Студэнты-старшакурснікі, вырашаючы яе, абапіраюцца ўжо на пэўны вопыт, якім і дзеліцца трэцякурснік філалагічнага факультэта **Міхаіл Ціцянкоў:**

— Раней у мяне таксама пастаянна не хапала часу. Галоўная прычына (зараз мне знайсці яе няцяжка) была ў тым, што не было ў мяне ніякай сістэмы падрыхтоўкі да заняткаў. І значная колькасць часу прападала дарма. Зараз я добра ведаю, што нават калі суткі расцягнуць на некалькі гадзін, то часу ўсё роўна не хапала б. Значыць, справа не ў гэтым. За дваццаць чатыры гадзіны можна і патрэбна зрабіць усё, што чакае вырашэння.

**— Ці дзейсная для цябе ў час сесіі тая сістэма падрыхтоўкі да заняткаў, якой ты карыстаешся на працягу семестра?**

— Для мяне вялікіх змен распарадку дня з надыходам сесіі не бывае. Хіба толькі крышачку напружаней займаюся, ды больш, чым звычайна, аб'ём матэрыялу. А сама аснова заняткаў, парадак падрыхтоўкі не змяняюцца: з ранку і ўдзень рыхтуюся, чытаю, а вечар— час адпачынку. Як бачна, мая сістэма нічым не адрозніваецца ад тых, па якіх рыхтуюцца многія студэнты. Галоўнае ў час сесіі—менш увагі на пабочныя справы.

**— Нават старшакурснікаў сесія «замыкае» ў чатырох сценах чытальнай залы або пакоя. Ці бываеш ты «палонным» чатырох сцен, ці знаходзіш вольныя гадзіны ў перыяд экзаменаў?**

— У мяне ёсць адно цвёрдае правіла: два разы ў тыдзень наведваць тэатры або кіно. Акрамя таго, я заўзяты тэлеглядач. Ад усяго гэтага я не адмаўляюся і ў перыяд экзаменаў. Часу для заняткаў днём хапае. А калі добра папрацуеш, то вечарам чаму не адпачыць?!

**— На мой погляд, любая грамадская работа займае нямала часу, а ты — намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта па ідэалагічнай рабоце. Ці хапае на ўсё часу?**

— Хочацца сказаць толькі адно, што грамадская работа абумоўлівае час, а не наадварот. Гэта маё цвёрдае перакананне. Наогул, не ўяўляю сабе жыцця ў баку ад грамадскай работы. Яна не толькі не перашкаджае, але і ў многім дапамагае. Па-мойму, гэта нецікава — замкнуцца сярод кніг, няхай нават і ў час экзаменаў. З людзьмі значна цікавей.

**— Міша, якая будзе твая парада першакурснікам перад іх першай экзаменацыйнай сесіяй?**

— Галоўнае, не растрачваць сваіх сіл дарэмна, не кідацца з адной крайнасці ў другую. Заўсёды і ўсюды помніць, што ўсё добра толькі ў меру.

**В. ЕРМАКОВІЧ.**

# СУСТРЭЧА СЯБРОЎ

У аўдыторыі геафака заканчваюцца апошнія прыгатаванні, устанаўліваецца апаратура. Людна ў памяшканнях.

Сёння ў гасцях у студэнтаў — воіны падшэфнай часці.

Выпускнік факультэта старшы лейтэнант Громаў гаворыць аб даўнім моцным сяброўстве воінаў са студэнтамі-географамі. Ён расказвае аб слаўным баявым шляху дывізіі, ае героях, аб першым камдыве, аб удзеле дывізіі ў вызваленні Беларусі, Польшчы ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

На сцэне — воінскі ансамбль «Чырвоныя пагоны». Выступленне сваё ён пачынае песняй кампазітара Мартынава «Трубка міру». За ёй гучыць «Песня аб крывавых кветках» на эстонскай мове, прысвечаная ахвярам фашызму. Песні змяняюцца заўзятай салдацкай пляскай «На прывале». Ад душы смяюцца студэнты, слухаючы гумарыстычны расказ А. Аркапава «Крос».

Доўга не змаўкалі апладысменты. Асабліва бурна апладзіруюць вакальнай групе ансамбля. Гледачы не хочуць адпускаць артыстаў са сцэны...

Гучаць словы ўдзячнасці, запрашэнне прыязджаць яшчэ і яшчэ. Пад акампанемент ансамбля «Чырвоныя пагоны» ідзе вечар адпачынку.

**Н. НОВІКАВА.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

# *НАШ КУРАТАР*

Нямала ёсць добрых куратараў на юрыдычным факультэце. Гэта К. А. Барзова, М. І. Глебаў, В. С. Швецаў і іншыя. Але сёння мне хочацца расказаць пра дацэнта кафедры крымінальнага права Кацярыну Васільеўну Кічыгіну, куратара VI групы трэцяга курса.

За час працы ў гэтым калектыве Кацярына Васільеўна заваявала любоў і павагу студэнтаў як патрабавальны выкладчык, добры арганізатар і чулы таварыш.

Кацярына Васільеўна абавязкова пацікавіцца, хто прапусціў заняткі і па якой прычыне, чаму не падрыхтаван той ці іншы студэнт да практычных заняткаў, абавязкова пагаворыць з гэтымі студэнтамі, а калі патрэбна, то акажа практычную дапамогу, маральна падтрымае.

Яна з'яўляецца не толькі ініцыятарам культпаходаў, канферэнцый чытачоў, але і прымае ў іх актыўны ўдзел. Вось адзін з прыкладаў. Кацярына Васільеўна любіць творчасць пісьменніка В. Шукшына і змагла зацікавіць ёю студэнтаў. Калектыўна праглядзелі кінафільм «Каліна чырвоная», а затым разам абмеркавалі яго.

Студэнты захацелі глыбей пазнаць творчасць В. Шукшына. І вось праведзена канферэнцыя чытачоў. На яе запрасілі студэнтаў IV групы. Ва ўступным слове Кацярына Васільеўна расказала пра самога пісьменніка. Студэнтка Зоя Крэсік зрабіла агляд творчасці Шукшына. А затым выступілі Г. Лісоўскі, В. Жышкевіч, В. Кавальчук, В. Клопаў, С. Нікіціна, С. Гузаў і іншыя. Яны адкрывалі штосьці новае для сябе, раней невядомае. Спрачаліся, даказвалі...

Так для Кацярыны Васільеўны куратарства становіцца не толькі абавязкам, доўгам, але і асабістай неабходнасцю.

**М. КОРЗУН,**
**сакратар камітэта камсамола юрфака.**

# ГНК *Народны* КАНТРОЛЬ ФІЛАЛАГІЧНАГА

Закончыўся першы год работы народных кантралёраў філалагічнага факультэта, якія былі выбраны ў снежні 1973 года. Часу прайшло нямала, і ўжо можна падвесці некаторыя вынікі, адзначыць недахопы і прадумаць шляхі іх выпраўлення.

Перш за ўсё хочацца сказаць аб тым, што новы склад ГНК факультэта прыняў добрую эстафету ад папярэдняга, які ўзначальвала камуніст В. А. Захарава. На справаздачна-выбарнай канферэнцыі мы атрымалі наказ, у якім канкрэтна і ясна указаны слабыя звенні ў рабоце факультэта. На іх мы і сканцэнтравалі галоўную ўвагу, што і знайшло адлюстраванне ў гадавым плане работы ГНК. Неабходна адзначыць і яшчэ адну важную акалічнасць: факультэт трымае агульнауніверсітэцкі пераходны чырвоны сцяг, і гэта ўскладвае на ўсе яго арганізацыі, у тым ліку і на ГНК, як вялікую адказнасць, так і дадатковыя абавязкі.

У ГНК увайшлі вопытныя камуністы, якія добра ведаюць работу: І. Ц. Ішчанка, Л. А. Царанкоў, А. А. Скачко, І. В. Шаблоўская, якія ўзначалілі ўсе звенні яе работы. Члены групы пільна вывучылі «Палажэнне аб органах народнага кантролю ў СССР», пазнаёміліся з памяткай народнаму кантралёру Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, усе члены групы праслухалі курс лекцый у агульнаўніверсітэцкай «Школе народных кантралёраў».

Усё гэта дапамагло групе рэзультатыўна змагацца з недахопамі ў арганізацыі вучэбнага і навукова-даследчага працэсаў, захавання дзяржаўнай працоўнай дысцыпліны.

У гэтым годзе група выкарыстала такія метады, якія дазволілі ўцягнуць у ажыццяўленне кантрольнай дзейнасці многіх членаў калектыву. Так, напрыклад, праверка арганізацыі вучэбнага працэсу на вячэрнім аддзяленні была праведзена сумесна з партбюро і прафбюро факультэта. У ёй, акрамя членаў ГНК, актыўна ўдзельнічала вялікая група камуністаў і членаў прафсаюзнай арганізацыі. Вынікі праверкі абмяркоўваліся на адкрытым партыйным сходзе. Важна пры гэтым адзначыць, што ГНК ставіла мэту не столькі выявіць і канстатаваць тыя ці іншыя недахопы, колькі папярэдзіць іх і ў працэсе праверкі, сумесна з правяраючымі знайсці шляхі выпраўлення.

Такім жа чынам, з прыцягненнем вялікай групы правяраючых і пры непасрэдным кіраўніцтве з боку партбюро была праверана арганізацыя міжсесійнай работы студэнтаў на факультэце (старшыня камісіі І. В. Шаблоўская). Народныя кантралёры праверылі наяўнасць і забеспячэнне студэнтаў вучэбнымі праграмамі з прыкладаннем плана вучэбных заняткаў, графіка абавязковых заданняў на семестр і метадычных указанняў па вывучэнню найбольш працаёмкіх дысцыплін. Правераны індывідуальныя формы ўліку выкладчыкамі бягучай паспяховасці студэнтаў, улік наведвання заняткаў і меры, якія прымаюцца па павышэнню паспяховасці і наведвання з боку кафедраў і дэканата.

ГНК пазнаёмілася з арганізацыяй і кантролем работы куратараў з боку кафедр і дэканата, з арганізацыяй студэнцкай навуковай работы. Вынікі праверкі былі дакладзены партбюро факультэта (дакладчык І. В. Шаблоўская) і агульнаўніверсітэцкай групе народнага кантролю.

Члены ГНК факультэта пазнаёміліся з праектам раскладу вучэбных заняткаў. Трэба адзначыць, што наш факультэт з'явіўся ініцыятарам распрацоўкі і укаранення навуковых асноў планавання вучэбнай работы (методыка планавання распрацавана намеснікам дэкана М. М. Піпчанкам).

Асобна правяралася арганізацыя грамадскага харчавання студэнтаў на факультэце і ў інтэрнаце (пытанне заслухоўвалася на пасяджэнні агульнаўніверсітэцкай ГНК, дакладчык І. В. Шадурскі).

На працягу года ГНК двойчы пракантралявала выкарыстанне стыпендыяльнага фонду, правільнасць размеркавання месц у інтэрнаце, праверыла правільнасць вызначэння аб'ёму вучэбных даручэнняў прафесарска-выкладчыцкага саставу.

На пасяджэннях бюро рэгулярна абмяркоўваюцца вынікі праверак, старанна прадумваюцца і распрацоўваюцца планы чарговых мерапрыемстваў.

У выніку як становічае патрэбна адзначыць, што група працуе ў цесным кантакце з партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыямі. Праверка ў нас становіцца справай не асобных кантралёраў, а усяго калектыву, кроўна ў ёй зацікаўленага. Праведзеная намі работа садзейнічае ажыццяўленню галоўнай задачы факультэта — падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Было б няправільным лічыць, што ў нашай рабоце няма ўпушчэнняў і недахопаў. Мы вельмі слаба ўцягваем у работу студэнцкі актыў, дрэнна ў нас працуе сектар галоснасці, маюцца ўпушчэнні ў кантролі за выкананнем рашэнняў. Да ліку апошніх патрэбна аднесці безрэзультатнасць неадноўчы ўзнятых пытанняў матэрыяльнага забеспячэння і захавання сацыялістычнай уласнасці, марудлівасць у паляпшэнні грамадскага харчавання студэнтаў на факультэце і ў інтэрнаце, давядзення электраасвятлення ў аўдыторыях, кабінетах да санітарных норм і інш.

Думаем, што кіраўніцтва універсітэта прыслухаецца да нашага голасу і дапаможа выправіць палажэнне.

**Г. СІНЕНКА,**
**старшыня групы народнага кантролю філалагічнага факультэта.**

# ЖУРФАКУ — 30 ГОД

## УПЭЎНЕНЫМ КРОКАМ

**Р. В. БУЛАЦКІ, ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТА, ПРАФЕСАР**

Стварэнне факультэта ў цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны з'явілася яркім сведчаннем вялікай увагі і клопату Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб уздыме культуры беларускага народа.

Для спецыяльнай падрыхтоўкі журналістаў была створана кафедра тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку. У 1944 годзе пачалі вучобу студэнты I—III курсаў. Звыш 90 працэнтаў студэнтаў факультэта першых пасляваенных гадоў — гэта дэмабілізаваныя з радоў Савецкай Арміі, былыя партызаны, якія загартаваліся ў баях з фашысцкай нечысцю. Многія з іх ужо мелі вопыт газетнай работы.

Першы выпуск журналістаў адбыўся ў 1948 годзе. Тады атрымалі дыпломы газетчыкаў 11 чалавек. А сёння выпускнікі факультэта— гэта вялікая армія работнікаў друку, радыё, тэлебачання, выдавецтваў і інфармацыйных агенцтваў. Сярод іх Герой Савецкага Саюза, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Філімонаў, карэспандэнт «Правды» па Беларусі, лаўрэат прэміі імя П. М. Лепяшынскага пісьменнік І. Новікаў, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» паэт Г. Бураўкін, карэспандэнты «Известий» па Беларусі М. Матукоўскі і М. Шыманскі, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова, міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч, галоўны рэдактар часопіса «Бярозка» В. Зуёнак, рэдактар аддзела паэзіі часопіса «Маладосць» паэт М. Аўрамчык, загадчык аддзела культуры і літаратуры часопіса «Работніца і сялянка» пісьменніца Г. Васілеўская, рэдактар «Гродненской правды», кандыдат гістарычных навук А. У. Богуш, заслужаны дзеяч культуры БССР, лаўрэат прэміі Саюза журналістаў СССР рэдактар ганцавіцкай райгазеты «Савецкае Палессе» В. Д. Праскураў.

Некаторыя рэдакцыі рэспубліканскіх газет — «Знамя юности», «Чырвоная змена», «Звязда» і іншыя— амаль цалкам укамплектаваны нашымі выпускнікамі. На Беларускім радыё і тэлебачанні, напрыклад, працуюць каля 90 нашых выхаванцаў.

Значная частка паэтаў і пісьменнікаў нашай рэспублікі — выпускнікі факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна. Сярод іх Мікола Аўрамчык, Іван Новікаў, Георгій Шыловіч, Барыс Сачанка, Іван Чыгрынаў, Міхась Стральцоў, Іван Пташнікаў, Васіль Зуёнак, Галіна Васілеўская, Вольга Сіманава, Яўген Курто, Міхась Герчык, Анатоль Чаркасаў, Уладзімір Паўлаў, Іван Сіпакоў.

Асабліва бурна развіваецца наш факультэт пасля 1967 года. Калі восем гадоў назад на факультэце была адна кафедра тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку, у веданні якой былі ўсе спецыяльныя дысцыпліны, то цяпер мы маем чатыры.

Факультэт не толькі рыхтаваў кадры для газет, часопісаў, радыё, тэлебачання, выдавецтваў, але і кадры выкладчыкаў. Калі ў 1946—1947 гадах на факультэце працавалі толькі два выкладчыкі, якія чыталі журналісцкія дысцыпліны — М. С. Зярніцкі і Г. С. Акулаў, — то сёння на факультэце 26 выкладчыкаў. Сярод іх загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання прафесар М. Я. Цікоцкі, прафесар В. А. Пыжкоў, дактары філалагічных навук — загадчык кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі Б. В. Стральцоў, А. І. Наркевіч, дацэнт М. Е. Дастанка — загадчык кафедры тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання, дацэнты Н. А. Сніцарава, Е. Л. Бондарава, А. І. Раковіч, С. М. Грабчыкаў, І. І. Сачанка.

Вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў нам аказваюць практычныя работнікі друку. Кожны год яны запрашаюцца на факультэт для чытання лекцый, правядзення практычных заняткаў, кіраўніцтва дыпломнымі і курсавымі работамі. Сярод іх— рэдактары рэспубліканскіх газет, радыё і тэлебачання, выдавецтваў.

У даваенны час у рэспубліцы амаль адсутнічала навукова-даследчая работа ў галіне гісторыі, тэорыі і практыкі партыйна - савецкага друку, не было прац аб публіцыстычнай спадчыне У. І. Леніна і публіцыстаў ленінскай школы, даследаванняў у галіне беларускай стылістыкі. Па гэтых пытаннях у пасляваенны час, і асабліва за апошняе дзесяцігоддзе, выкладчыкі факультэта выпусцілі ў свет шэраг манаграфій, брашур, зборнікаў. Выкладчыкамі факультэта надрукавана вялікая колькасць навуковых артыкулаў, якія змешчаны ў газетах, зборніках прац, часопісах. Толькі, напрыклад, за 1974 год агульны аб'ём гэтай прадукцыі складае каля 100 аркушаў. Актыўны ўдзел выкладчыкі факультэта прымалі ў навуковых канферэнцыях, якія адбыліся ў Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Львове, Алма-Аце, Мінску і іншых гарадах.

З аднаўленнем у 1967 годзе факультэта было створана самастойнае студэнцкае навуковае таварыства, якое каардынуе работу па гісторыі журналістыкі, публіцыстыкі ленінскай школы, сучаснай публіцыстыцы, тэорыі і практыцы радыё і тэлебачання.

Члены СНТ прымаюць актыўны ўдзел у навуковым жыцці універсітэта і горада. Высокі навуковы ўзровень іх работ дае магчымасць нашым студэнтам штогод выступаць у іншых ВНУ краіны. Удзельнікі СНТ былі гасцямі Ленінградскага, Кіеўскага, Львоўскага і іншых універсітэтаў.

Цікавай традыцыяй СНТ становіцца выпуск альманаха «Творчасць журналіста». У ім друкуюцца арыгінальныя навуковыя працы і творчыя выступленні студэнтаў. СНТ выпускае свой бюлетэнь, на старонках якога асвятляецца навуковае жыццё гурткоў.

На факультэце праводзіцца значная выхаваўчая работа, якая падпарадкоўваецца задачам павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў высокай кваліфікацыі, ажыццяўляюцца шматлікія масавыя мерапрыемствы, шырока практыкуецца правядзенне вечароў-сустрэч з героямі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, героямі працы, вядучымі журналістамі, пісьменнікамі, дзеячамі навукі, і культуры.

Журналіст — гэта, перш за ўсё, актыўны баец партыі. Ён павінен быць палітычна загартаваным чалавекам. Для яго, па словах Ф. Энгельса, недастаткова добрых імкненняў, сумленнасці, мужнасці, стойкасці, яму неабходны розум, яснасць у поглядах, добры стыль, шмат ведаў.

Калектыў факультэта журналістыкі прыкладае ўсе сілы, каб рыхтаваць іменна такіх журналістаў.

## ДУШОЮ І СЭРЦАМ АДДАНЫ

*На мінулагоднім конкурсе мастацкай самадзейнасці я была сярод гледачоў і шчыра апладзіравала, ад душы радуючыся за наш тэатр мініяцюр. Не менш горача білі ў далоні мае суседзі. Але яны не ведалі галоўнага, як пісаліся сцэнарыі, адпрацоўваліся ролі. Нарэшце, яны не ведалі, што для многіх «стэмаўцаў» тэатр стаў асноўным складаемым іх студэнцкага жыцця.*

**Саша ПРАСТАТА, студэнт II курса:**

— У маім дзённіку ад 25 лютага гэтага года ёсць запіс: «З сённяшняга дня стаў удзельнікам тэатра мініяцюр». Аб'ява, што паведамляла аб стварэнні на факультэце такога тэатра, з'явілася яшчэ раней, я не спяшаўся праявіць ініцыятыву, каб хутчэй трапіць туды. Я акуратна хадзіў на рэпетыцыі хору, але аднойчы вельмі захацелася паглядзець, як там у «стэмаўцаў» справы, чым яны займаюцца. Ледзь прыкметна прыадчыніў дзверы і зазірнуў у аўдыторыю. Маэстра, нечым незадаволены, прыкрыкнуў на мяне: «Ну што?! Або зачыні дзверы, або заходзь сюды!» Мяне здзівіў такі тон, і я вырашыў: «Ах, так, зайду, і рабі са мной што хочаш, калі ты такі злы!»

На маё здзіўленне, рэжысёр аказаўся на рэдкасць вясёлым і дабрадушным чалавекам. Мы з ім хутка пасябравалі і навучыліся пасля разумець адзін другога з паўслова. Юрый Віктаравіч «ганяў» маленькія сцэнкі па некалькі разоў, злаваўся; мы працавалі і працавалі.

Ролі ён падбіраў нам па нашых характарах. Мае тры невялікія ролі былі вельмі розныя. У першай сцэне я іграў прафесара, да глыбіні душы ўлюбёнага ў свой прадмет, крыху наіўнага, настрашанага нечаканымі «конікамі» студэнтаў і крыху самаўлюбёнага. Другая — поўная супрацьлегласць першай — дзяжурны выкладчык у інтэрнаце. І трэцяя роля — студэнт-прайдзісвет, які марыць пасля заканчэння ВНУ застацца там, дзе лепш, цяплей і цішэй.

Тэатр я люблю, як люблю кіно, цырк, эстраду. А свой люблю ўдвайне, таму што ў яго ўкладзена наша старанне. У ім раскрыліся нашы здольнасці, нашы пачуцці.

Мы вельмі хваляваліся ў час прэм'еры, ды гэта і зразумела: некаторыя з нас упершыню стаялі на сцэне такой вялікай залы. Паверыць у поспех у свае магчымасці дапамагла Таццяна Дзмітрыеўна Арлова. Яна як быццам адчувала, што нам патрэбна: перад конкурсам пагутарыла з кожным, павіншавала, уручыла невялічкія сувеніры і ўвесь час заставалася з намі — аж пакуль пад бурныя апладысменты не сышлі са сцэны.

Хачу закончыць дзённікавым запісам ад 25 красавіка (пасля прэм'еры): «Сёння праходзіў агляд факультэцкай самадзейнасці. Поспех паўнейшы: гледачы смяяліся і апладзіравалі з усёй сілы! Пасля спектакля было столькі віншаванняў ад сяброў, што ледзь руку не адарвалі!»

І напаследак мае пажаданні тэатру. Не хачу жадаць поспеху — поспех кружыць галаву. Хачу пажадаць выдатнай працы — такой плённай, каб на новым аглядзе мастацкай самадзейнасці быць недасягальнымі для сапернікаў!

**Света КАМІНСКАЯ, студэнтка II курса:**

— Я прыйшла ў СТМ ужо маючы некаторы вопыт, бо яшчэ ў Салігорскім Доме культуры ўдзельнічала ў пастаноўках розных спектакляў. На маім рахунку было ўжо 10 эпізадычных і 4 галоўныя ролі, у тым ліку і любімая — маленькая разбойніца са «Снежнай каралевы» Андэрсена.

І тым не менш удзел у «стэме» займаў многа часу. Мая гераіня Галя — поўная супрацьлегласць маленькай разбойніцы: мілая, ціхая, добрая і сціплая. Гэта крыху не ў маім характары. І, ацэньваючы цяпер свае выкананне гэтай ролі, скажу шчыра, што не зусім усё гладка атрымлівалася. Я іграла і памятала, што я на сцэне, і нават ацэньвала сябе з пазіцыі гледача.

Але галоўнае, што я не расчаравалася ў тэатры, і ў гэтым навучальным годзе ўсё чакаю, што не сёння дык заўтра з'явіцца аб'ява, якая зноў пакліча нас на рэпетыцыю.

**Наташа ПЯТРОЎСКАЯ, студэнтка III курса:**

«Стэм» — гэта здароўе! Так-так. Вось папрацуеш на рэпетыцыях гадзінкі 2—3, змораны прыходзіш дадому, а пачуццё такое, быццам першы раз зразумеў, што малады і здаровы!

«Стэм»—гэта смех! Колькі разоў мы смяяліся самі над тым, чым збіраліся развесяліць гледача. Разумеецца, над адным і тым жа героем, над кожнай новай знаходкай таварыша.

«Стэм» — гэта і наш сярдзіты, але добры Юрый Віктаравіч Плотнікаў, наш слаўны рэжысёр.

Колькі шчаслівых хвілін падарыў ён нам, калі «наігрываў» ролі, прыкладна паказваў тое, што хацеў бы бачыць ад акцёра-«стэмаўца»!

І нарэшце «стэм» — гэта дружны калектыў. Ён аб'ядноўвае студэнтаў розных курсаў, розных узростаў, здольнасцей і захапленняў. Як мы любілі Дзімку Новікава за яго студэнта-няўдачніка, як захапляліся рэдактарам Аркашы Шульмана, какеткай-выкладчыцай Наташы Панамаровай, Галачкай Светы Камінскай!

Усё, што звязана са «стэмам»,— здарова!

*Запісала М. ШЫМКО.*








У гэты вечар Дом мастацтва, дзе праходзіла святкаванне юбілею, ператварыўся ў месца сустрэч, успамінаў, кветак, гумару, песень... З рэдакцый, радыё- і тэлекамітэтаў, выдавецтваў спяшаліся на гасцінны агеньчык выхаванцы факультэта журналістыкі.

«Мы адна сям'я, і ўсім нам—трыццаць!»—неаднойчы гучала са сцэны з вуснаў выкладчыкаў, выпускнікоў, студэнтаў.

Успаміны аб учарашнім дні факультэта, расказы аб яго сённяшніх поспехах перамяжаліся з выступленнямі спевакоў, самадзейных артыстаў. Кожны курс расказаў аб сваёй гісторыі—і не было ў гэты час у зале ніводнага сумуючага твару. Мініяцюры, сцэнкі з жыцця студэнтаў і яшчэ—шмат песень. «Трое сутак ісці, трое сутак не спаць дзеля некалькіх радкоў у газеце!» — спявала зала, спявала аддана і шчыра.

Фота В. ДРАЧОВА.

# СТУДЗЕНЬ

**1 студзеня**—Навагодняе свята.

**1 студзеня**—1959—Перамога Кубінскай рэвалюцыі. Дзень вызвалення Кубы.

**1 студзеня**—1919—Утварэнне Беларускай ССР.

**2 студзеня**—50 год з дня ўтварэння (1925) Горна-Бадахшанскай аўтаномнай вобласці.

**11 студзеня**—100 год з дня нараджэння Р. М. Гліэра (1875—1956), савецкага кампазітара, дырыжора і педагога.

**15 студзеня**—125 год з дня нараджэння Міхаіла Эмінэску (1850—1889), румынскага паэта.

**16 студзеня**—70 год з дня нараджэння (1905) А. О. Саксэ, латышскай савецкай пісьменніцы.

**17 студзеня**—30 год з дня вызвалення (1945) Варшавы Савецкай Арміяй сумесна з 1-й арміяй Войска Польскага ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**21 студзеня**—70 год з дня нараджэння В. Л. Васілеўскай (1905—1964), польскай і савецкай пісьменніцы.

**21 студзеня**—1924—Памёр У. І. Ленін.

**22 студзеня**—70 год з дня расстрэлу (1905) царскімі войскамі мірнай дэманстрацыі рабочых у Пецярбургэ (Крывавая нядзеля).

**22 студзеня**—200 год з дня нараджэння Андрэ Ампера (1775—1836), французскага фізіка і матэматыка.

**28 студзеня**—30 год назад (1945) было завершана вызваленне Савецкай Літвы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.






## ВЯСЁЛЫ АЛОВАК



Без слоў.



Вася! Ау-уууу!

## ЭКЗАМЕН

— Прафесар, вам часам халадзільнік не патрэбен?

— Не, часам не патрэбен. Адказвайце па білету.

— Зразумела. А пылесос?

— І пылесос не патрэбен. Адказвайце па білету.

— Што, няўжо ў вас дома пылу няма?

— Ёсць, мусіць. Я не шукаў.

— Дык вам і не патрэбна шукаць. Пылесосам хуценька — р-раз — і гатова.

— Дзякую за параду. Вы на білет адказваць будзеце?

— А вы — наконт халадзільніка?

— Якога халадзільніка? Вы гаварылі — пылесос.

— Пылесосам пыл глытаць, халадзільнікам марожанае рабіць.

— Паслухайце, вы што, імі гандлюеце?

— Што вы, прафесар, адкуль у студэнта халадзільнік? Не са стыпендыі ж.

— Вось я і пытаюся: адкуль у вас халадзільнік?!

— І пылесос.

— І пылесос!!!

— А ў мяне іх, прафесар, няма.

— Як — няма?

— Так. Дай, думаю, проста спытаюся ў вас наконт пылесоса.

— І... халадзільніка?..

— Вось іменна, і халадзільніка. Спытаў, аказваецца, няма. І ўсё.

— Не, не ўсё!!! Ёсць! Халадзільнік!

— Дзе — халадзільнік?

— Я — халадзільнік! А ты — пылесос!

— Добра, прафесар, я — пылесос, вы — халадзільнік. Як сябе адчуваеце? Пераходжу на прыём.

— Здавальняюча.

— Здавальняюча?

— Здавальняюча!!!

— Цудоўна. Вось тут і напішыце: «Здавальняюча». Вось так. І падпішыцеся... Стоп! Што вы пішаце? Нейкі «халадзільнік»? Ну ўсё. Усё сапсавалі. Прыйдзецца пераздаваць іншаму.

**В. ЯГОРАЎ.**

## ДЫЯЛОГІ

— Паважаны прафесар, я лічу, што «нездавальняюча» я ўсё-такі не заслужыў.

— Я таксама так лічу, але, на жаль, адзнакі ніжэй за «нездавальняюча» не існуе.

**Прафесар:** — Што вы можаце сказаць пра «Пісьмо Бялінскага да Гогаля»?

**Студэнт:** — Ну, ведаеце, я чужых пісьмаў не чытаю!

**Прафесар:** — Экзамен —гэта як тэатр: вы акцёр, я глядач.

**Студэнт:** — Цудоўна! Зараз я пазаву суфлёра!

### УВАГА! КОНКУРС!

Аб'яўляецца конкурс на студэнта, які наведаў усе лекцыі, усе практычныя ў гэтым семестры і ні разу не спазніўся на заняткі.

У якасці прыза пераможцу — права свабоднага наведвання.

# РАСКАЗВАЮЦЬ ЛАЎРЭАТЫ...

**У канцы года ва універсітэт прыйшла радасная вестка: нашы народны ансамбль народных інструментаў і народны ансамбль танца «Крыжачок» сталі лаўрэатамі абласных і рэспубліканскіх конкурсаў.**

**МІХАІЛ АРКАДЗЬЕВІЧ ЛІСІЦЫН, заслужаны работнік культуры, кіраўнік народнага ансамбля народных інструментаў:**

Сёлета мы сустракаем Новы год у добрым настроі. Як не радавацца — на абласным конкурсе аркестраў і ансамбляў народных інструментаў ВНУ і сярэдніх навучальных устаноў наш калектыў разам з аркестрам педінстытута падзяліў два першыя месцы. Я лічу— гэта заслуга перш за ўсё нашых лепшых выканаўцаў Л. Козак (цымбалы), А. Лукашык (домра), Г. Яршова (баян), Я. Навакоўскага (балалайка), Л. Мордас (гуслі), Л. Варабей (кантрабас), Л. Клімовіч (фартэпіяна), С. Панамаровай (цымбалы). Увогуле я мог бы назваць усіх членаў аркестра — малайцы рабяты!

Канешне, пэўную ролю ў нашым поспеху адыграў і рэпертуар. Мы ведаем, гледачу падабаецца бурны «Марш-гратэск» Бялецкага, лірычная «Быліна аб зямлі беларускай» Жыновіча, задумлівая мелодыя вальса на тэму песні «У лесе прыфрантавым» і, зразумела, класіка — «У манастыры» Барадзіна.

Чым яшчэ абумоўлена перамога? Мабыць, агульнай прыўзнятасцю, акрыленасцю. Гэты зарад бадзёрасці мы заўжды атрымліваем пасля сваіх паездак па гарадах і вёсках з канцэртамі. Менавіта з такім настроем пакідалі рабяты Салігорск, дзе выступалі перад будаўнікамі і меліяратарамі, Тарту — вялікае свята студэнцкай песні...

Год памятны, і мне застаецца толькі пажадаць удзельнікам аркестра новых поспехаў, цяжкіх, але прыгожых перамог, здзяйснення мар, адна з якіх — замежная паездка.

**ТАМАРА ДУБРОЎСКАЯ, дамрыстка, студэнтка V курса геафака:**

— Я ў аркестры «бабулька»; пяць год праімчаліся — не дагоніш... Ды толькі такіх ветэранаў у нас шмат. Рэгулярна наведвае рэпетыцыі інжынер Б. Іваноў, хаця даўно ўжо скончыў універсітэт і працуе ў ІВЦ. Пяць год прыбягае да нас пасля школы цымбалістка Іра Корбут. Не забываюць аркестр намеснік дэкана філфака М. Піпчанка і многія іншыя.

Год адыходзіць... Я ўжо заканчваю універсітэт; набліжаецца развітанне з аркестрам. Калі буду працаваць у Мінску, гэтага не адбудзецца. Калі ж не... Тады жадаю вам, застаўшымся, заўсёды ўтрымліваць першыя месцы.

**ЛЮДМІЛА КАЛБАСКА, студэнтка III курса журфака:**

— У нас шмат традыцый: віншаванні з днём нараджэння, са святамі 23 лютага, 8 Сакавіка, канешне, з Новым годам. Мы разам ходзім на канцэрты ў філармонію; нядаўна слухалі выступленні музычных калектываў на фестывалі «Беларуская музычная восень».

У новым годзе, пэўна, з'явяцца новыя традыцыі, новыя сябры сярод нашых слухачоў.

**МІКАЛАЙ ВІКЕНЦЬЕВІЧ ЛАПША, кіраўнік народнага ансамбля танца «Крыжачок»:**

— Чым адметны быў год? Цяжка вызначыць, ці то выступленнямі на конкурсах, ці то паездкамі з канцэртамі. Вось, напрыклад, летам мы былі ў міжнародным студэнцкім лагеры «Сачоўка» пад Варшавай. Вы часам не бачылі часопіса «Польскае жыццё»? Ён змясціў вялікі каляровы фотарэпартаж аб выступленні «Крыжачка». Нейкі час польскія гледачы, убачыўшы, як ліха танцуюць студэнты польскія танцы, думалі, што мы іх суайчыннікі.

Шмат падзяк, грамат, дыпломаў прыбавілася ў нашым партфелі пасля паездак у Тарту, Вільнюскі універсітэт.

Наш калектыў — адзіны з самадзейных студэнцкіх ансамбляў рэспублікі — запрошан на дэкаду беларускага мастацтва і літаратуры, якая пройдзе ў 1975 годзе ў Літве і на Украіне. Зараз ансамбль рыхтуе да гэтага свята новыя танцы — літоўскі, беларускі «Шостак». Эскізы і касцюмы да іх робіць Беларускае тэатральнае таварыства.

Мы на парозе 30-годдзя ансамбля. Жадаю рабятам творчых поспехаў, моцнай дружбы!

**МІКАЛАЙ КОРАБ, танцор, студэнт I курса геафака:**

— Я прыйшоў у «Крыжачок» з падрыхтоўчага аддзялення БДУ. Справа ў тым, што танцаваў я яшчэ ў час службы ў арміі ў прафесійным ансамблі песні і пляскі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. Танцаваў разам з сябрам Косцем Гародкам. І зараз з ім у адным калектыве.

У гэтым годзе збылася мара — я стаў паўнаўладным студэнтам універсітэта. Так 1974 год увайшоў у маю біяграфію...

Ансамбль люблю. Люблю нашага Мікалая Вікенцьевіча, строгага і добрага; люблю танцаваць, асабліва «Барыню».

На Новы год глядзіце наша выступленне па тэлебачанню ў музычнай праграме «Вясёлка». А танцаваць мы пастараемся выдатна!

Запісала
**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**



ЭВАЛЮЦЫЯ ЎВАГІ.

Фота **В. ДРАЧОВА.**

«Белорусский университет» —орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ем — 1 друк. ар.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2000 экз. АТ 26051 Заказ № 1762.